# МАЁ ПЕРШАЕ СПАТКАННЕ З ЯНКАМ КУПАЛАМ

Трыццаць гадоў таму назад выступіў Янка Купала са сваім першым юнацкім творам у мінскай тагачаснай газеце “Северо-Западный край”, з вершам “Мужык”. Гэты факт для мяне стаўся вядомым значна пазней, і імя Кулалы я пачуў у першы раз у 1907 г., у той год, калі Купала пачаў дасылаць свае творы ў газету “Наша ніва”. Вясною гэтага года я працаваў у рэдакцыі “Наша ніва”, куды Купала рэгулярна пасылаўсвае вершы-песні.

Творы маладога паэта адразу ж звярнулі на сябе ўвагу сваім народным песенным ладам, сваім зазыўнымным свежым тонам і шырокім размахам. Яго вершы карысталіся вялікаю папулярнасцю і сведчылі аб высокай адаронасці юнака-паэта.

Мне цяпер трудна сказаць дакладна, у які іменна час і ў мяне і ў яго радзілася жаданне сустрэцца і пазнаёміцца ў непасрэднай жывой гутарцы. Адно можна сказаць, што такое жаданне было з аднаго і з другога боку. Мы абмяняліся пісьмамі — нажаль, пісем гэтых не захавалася. Адзін свой верш Купала прысвяціў мне. Верш, калі не памыляюся, быў змешчаны ў адным з № “Нашай нівы” за 1908 г. і канчаўся словамі:

*Нашто знаці ўсяго многа?*
*І так трапім да астрога.*

Гэтыя словы збыліся напалавіну: адзін з нас, якраз я, у той жа год і трапіў да астрога. Тры гады, праведзеныя ў астрозе, адарвалі мяне ад знешняга свету.

Праўда, сяды-тады рознымі нелегальнымі дарожкамі мне ўдавалася пасылаць свае творы ў “Нашу ніву”, але гэта былі выпадковыя здарэнні, і гэтыя ж астрожныя гады перашкаджалі нам сустрэцца.

Першае маё спатканне з Янкам Купалам адбылося летам 1912 г. Жыў я тады на Нёмане ў сваіх родных каля вёскі Мікалаеўшчына. Перад гэтым я напісаў пісьмо Купалу і стараўся падробна апісаць яму маршрут, як мяне знайсці, бо мы ўсё ж нарэшце цвёрда рашылі сустрэцца. Прасцей за ўсё было б, разумеецца, наняць на станцыі Стоўбцы балагола, ён і завёз бы за рубель пяцьдзесят капеек па адрасу.

Але мы тады былі не такія багачы, каб траціць на гэта паўтара рублі. Купала ні адзін раз расказваў пра сваё падарожжа ад Стоўбцаў да Смольні, дзе жыў я. Ён і цяпер памятае гэта добра. Справа ў тым, што дарога ад Стоўбцаў хоць і не дужа вялікая, кіламетраў 9, але вельмі блытаная і большаю часцю праходзіць лесам з рознымі адгаліненнямі дарог і дарожак управа і ўлева.

Купала, як расказваў ён потым, увайшоўшы ў лес, дзе асабліва многа розных бочных дарог, згубіў у іх арыентацыю. Якраз і ноч надышла. Але ён кіраваўся адным і правільным меркаваннем: ён ведаў, што я жыву на Нёмане, дзе павінны быць, па яго дагадках, нізіны. З боку ж гэтых нізін ён улавіў вільготнасць паветра. Гэта навяло яго на думку трымацца

стараны, з якой вільготнасць адчувалася. Яна і павяла яго па вернай дарозе. Праўда, у тую ноч да мяне ён не трапіў, але зайшоў у Мікалаеўшчыну, дзе і заначаваў, мінуўшы маю хату, якая стаяла трохі ў баку ад дарогі і на кіламетры два бліжэй сяла. Сустрэліся мы толькі назаўтра ў Мікалаеўшчыне, у таго настаўніка, якога апісаў я ў сваёй "Новай зямлі" ў вобразе "дарэктара".

Мне і па сённяшні дзень прадстаўляецца Янка Купала ў тым абліччы, у якім убачыў яго я ў першы раз: малады, крэпкі, узмужалы хлопец, адзеты на гарадскі фасон, хоць і не надта фарсіста, з карымі, вясёлымі, хітравата-насмешлівымі вачыма, з палкаю-крывулькаю.

Аб чым тады мы гутарылі, я не памятаю цяпер. З Мікалаеўшчыны зайшлі да мяне. Выпілі на спатканні кварту "царскіх слёз", як называлі тады гарэлку, і гэтым адзначылі сваё непасрэднае знаёмства і нашу сталую дружбу.

***Якуб Колас***

**Колас, Я**. Маё першае спатканне з Янкам Купалам / Я. Колас // Беларусь. — 2002. — № 9. — С. 5.